*Т. А. ДЖУМАНТАЕВА*

# КАНЦЭПЦЫЯ І СТРАТЭГІЯ ЗАХАВАННЯ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ПОЛАЦКА

*Артыкул прысвечаны навукова-практычнаму аспекту ролі сучасных музеяў Полацка ў захаванні і інтэрпрэтацыі культурнай спадчыны горада. Падкрэсліваецца, што ў сваёй рабоце музей сёння выступае як складаючая частка гісторыка-культурнай прасторы, якая ўплывае на ступень і характар трансляцыі вопыту пакаленняў. Распрацоўка канцэпцыі і стратэгіі захавання культурнай спадчыны горада стала адным з галоўных напрамкаў навукова-практычнай дзейнасці Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.*

Культурная прастора горада і музейная дзейнасць, арганізаваная вакол яе, як адна з формаў сацыяльна-культурнай практыкі, сталі ўмовамі адраджэння рэгіянальнай культуры. Культурны рэгіён, які фарміруецца пры ўзаемадзеянні прыроднага і культурна-гістарычнага асяроддзя з сучаснай сацыяльна-культурнай практыкай, з’яўляецца асноўным аб’ектам рэгіянальнай музейнай дзейнасці. У сучасных умовах музейная дзейнасць разумеецца як дзейнасць грамадства ў адносінах да прыроднай і культурнай спадчыны. Яна павінна стаць складаючай часткай мясцовых культурных працэсаў, а музейная сетка горада – сфарміравацца ў самастойны культурна-гаспадарчы комплекс. У выніку гэтага працэсу музей ператвараецца ў адзін з важнейшых рэгіёнаўтваральных фактараў, і структура музейнай дзейнасці пачынае супадаць з рэгіянальнай прадметна-прасторавай структурай культурнай спадчыны.

Што тычыцца музеяў-запаведнікаў, то яны наогул могуць служыць сімвалічнай крыніцай дыстантных вобразаў вялікага маштабу. Напрыклад, вобраз Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка рэдукуецца да аднаго сімвала – Сафійскага сабора, які ў сваю чаргу факусіруе ў свядомасці людзей вобраз краіны ў цэлым.

Аднак навуковыя даследаванні аб удзеле музеяў горада ў працэсе захавання культурнай спадчыны адсутнічаюць як у замежнай, так і айчыннай літаратуры. Полацк з’яўляецца асабліва значным гісторыка-культурным комплексам краіны з трывалымі музейнымі традыцыямі ў справе музеефікацыі гістарычных тэрыторый. Менавіта таму ў якасці аб’екта даследавання ўзята сукупнасць музеяў Полацка. Прадметам даследавання з’яўляюцца асаблівасці функцыянавання і развіцця інстытута музея і яго роля ў захаванні культурнай спадчыны на фоне культурнай прасторы горада.

Дадзеная тэма звязана з працэсам падрыхтоўкі навуковых матэрыялаў для намінацыі помнікаў Полацка на ўключэнне іх у Спіс сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. З гэтай нагоды прааналізаваны артыкулы Канвенцыі ЮНЕСКА па ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны [2]; юрыдычныя крыніцы, якія рэгулююць працэсы аховы і рэстаўрацыі помнікаў у Рэспубліцы Беларусь [6]; артыкулы Г.Кандрацьевай і І.Макавецкага аб захаванні помнікаў сусветнай спадчыны ў Беларусі і Расіі [3; 5]. Найбольш значнымі для навуковай работы па стварэнні канцэпцыі і стратэгіі захавання культурнай спадчыны Полацка сталі “Дэкларацыя правоў культуры” Д.С.Ліхачова [4, с. 647–651]; праца В.В.Глінніка аб гістарычных цэнтрах гарадоў Беларусі [1] і дадаткі да пастаноў урада Санкт-Пецярбурга аб захаванні культурнай спадчыны [8].

У сучаснай культуры музей з’яўляецца шматфункцыянальным сацыякультурным інстытутам, адным з асноўных кампанентаў сферы культурнай спадчыны. Пашырэнне меж музейнай дзейнасці сведчыць аб тым, што яна набывае ўсё большае сацыякультурнае значэнне. Музей стаў месцам развіцця культурнай разнастайнасці, якая ў сваю чаргу стала характэрнай рысай сённяшняга жыцця, здольнай процістаяць глабальнай культуры і глабальнай ідэнтычнасці.

Даследаванне гісторыі фарміравання і развіцця музеяў Полацка, а таксама аналіз музейнай практыкі і музейных традыцый даюць магчымасць зрабіць высновы, што ў XXI ст. роля музеяў у глабальнай прасторы культуры і на месцах будзе ўзрастаць, таму што:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– музей – гэта сістэма, згодна якой распрацоўваюцца і аналізуюцца базы даных па культуры і навакольным асяроддзі; захоўваюцца, збіраюцца, вывучаюцца пэўныя калекцыі і помнікі і дэманструюцца праз пастаянныя і часовыя экспазіцыі і выставы, часта з дапамогай новых інфармацыйных тэхналогій. Валодаючы значнымі інфармацыйнымі рэсурсамі, музей дзейнічае ў інтарэсах падтрымкі і распаўсюджвання ведаў, захавання гістарычнай памяці і выхавання адказнасці за стан прыроднага і гісторыка-культурнага асяроддзя. Сіла музея ў аўтэнтычнасці, арыгінальнасці, у магчымасці даваць характарыстыкі з'явам і фактам;

– музей – гэта сістэма, якая ў абставінах глабальных перамен спрыяе выжыванню пры ўмовах выкарыстання інфармацыйнага рэсурсу музея для трансляцыі сацыякультурнага вопыту. Музеі дапамагаюць людзям стаць талерантнымі і адолець праблемы існавання шматкультурнага свету. Значнасць музея ў эпоху глабалізацыі заключаецца ў тым, што ён спрыяе вырашэнню жыццёвых праблем праз структураванне рэчаіснасці і фарміраванне культурнай і духоўнай самабытнасці.

Традыцыі, якія былі характэрнымі для кожнага з перыядаў музейнага будаўніцтва ў Полацку, атрымалі якаснае праламленне ў функцыянальнай мадэлі перспектыўнага развіцця Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Полацк, насычаны помнікамі архітэктуры і музеямі, захаваўшы гістарычную забудову XVIII – пачатку XX ст., здольны выканаць асноўную сацыяльную функцыю – дакументаваць культурна-гістарычнае асяроддзе і стаць горадам-музеем.

Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік – буйнейшы ў нашай краіне. Ён аб'ядноўвае адзінаццаць музеяў і з'яўляецца ўзорам тэарэтычнай і практычнай мадэлі перспектыўнага развіцця музейнай справы рэгіёну.

У выніку інтэграцыі аб'ектамі музейнага паказу з'яўляюцца не толькі рухомыя артэфакты, але і археалагічныя, архітэктурныя помнікі, ансамбль горада, прыродныя ландшафты. Музеефікацыя архітэктурных аб'ектаў дала магчымасць у шэрагу выпадкаў размясціць у будынках помнікаў гістарычныя, архітэктурна-мастацкія, мемарыяльныя і этнаграфічныя экспазіцыі. У выніку эвалюцыі музеяў нарадзілася магчымасць значна пашырыць поле музеялогіі, уключыўшы ў яго ўсю спадчыну.

У 1997 г. вядомы расійскі культуролаг Д.С.Ліхачоў напісаў "Дэкларацыю правоў культуры" [4, с. 647–651], якая была прынята Устаноўчым з'ездам кангрэса інтэлігенцыі Расійскай Федэрацыі ў снежні 1997 г. У Дэкларацыі ёміста сказана аб культурных каштоўнасцях і правах культуры на захаванасць (пры гэтым асаблівую надзею на ўдзел у лёсе сапраўдных каштоўнасцей культуры аўтар ускладаў на ЮНЕСКА). Канцэпцыя захавання гісторыка-культурнай спадчыны такіх старажытных гарадоў, як Полацк, павінна таксама арыентавацца на прызнанне яе каштоўнасці сусветным супольніцтвам.

У сувязі з гэтым Канвенцыя па ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны, прынятая ў рамках ЮНЕСКА ў 1972 г. (на 17-й сесіі Генеральнай канферэнцыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры) [2, с. 51–66], стала найбольш грунтоўным і значным дакументам, які можа рэгламентаваць магчымасць захаваць гісторыка-культурныя набыткі папярэдніх пакаленняў. У кастрычніку 1988 г. Беларусь далучылася да Канвенцыі. Галоўная асаблівасць Канвенцыі ў тым, што згодна з яе палажэннямі краіны-ўдзельніцы сумесна адказваюць за тую частку культурнай і прыроднай спадчыны, якая, на думку міжнароднай грамадскасці, мае "выключную універсальную каштоўнасць". У той жа час Канвенцыя заклікана дапаўняць, падмацоўваць і стымуляваць нацыянальныя ініцыятывы, ёю вызначаны прынцыпы фарміравання Спіса сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны, функцыі складання і публікацыі якога ўскладзены на Камітэт па ахове сусветнай спадчыны.

Больш за 800 аб'ектаў уключаны сёння ў Спіс (у Еўропе 48 краін з'яўляюцца дзяржавамі-ўдзельніцамі Канвенцыі, на тэрыторыі якіх знаходзяцца 244 помнікі сусветнай спадчыны [5, с. 3]). Наяўнасць у ім помнікаў той ці іншай краіны спрыяе яе міжнароднаму прэстыжу. Безумоўна, вялікае значэнне маюць і эканамічныя выгоды ў выніку прыцягальнасці такіх аб'ектаў для турыстаў. Нягледзячы на тое, што гэты аспект не з'яўляецца галоўным, тым не менш ён спрыяе дасягненню асноўнай мэты Канвенцыі – усведамленню каштоўнасці аб'ектаў на мясцовым, нацыянальным і міжнародным узроўнях, выхаванню насельніцтва на ідэях аховы акаляючага асяроддзя і павагі да культурнай спадчыны. Трансгранічныя аб'екты спрыяюць пашырэнню супрацоўніцтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паміж краінамі, абмену інфармацыяй у галіне культуры і экалогіі, а таксама распаўсюджванню ведаў у справе кансервацыі помнікаў.

У Спіс сусветнай спадчыны ўключаны чатыры аб'екты Беларусі: два трансгранічныя аб'екты – Белавежская пушча (сумесна з Польшчай, аб'ект прыроднай спадчыны ўключаны ў 1992 г.), Геадэзічная дуга Струве (уключаны ў 2005 г.) і два аб'екты, якія знаходзяцца непасрэдна на тэрыторыі Беларусі – Замкавы комплекс "Мір" (уключаны ў 2000 г.) і Архітэктурна-культурны комплекс рэзідэнцыі роду Радзівілаў у Нясвіжы (уключаны ў 2005 г.) [3, с. 3]. З дапамогай Цэнтра сусветнай спадчыны вывучаюцца магчымасці ўключэння ў Спіс іншых каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

З гэтай мэтай ў 2003 г. два эксперты Цэнтра (Пітэр Стот і Тадэвуш Бернатовіч) наведалі нашу краіну. Першымі аб'ектамі, з якімі яны пазнаёміліся, былі Сафійскі сабор (помнік архітэктуры сярэдзіны XI – сярэдзіны XVIII ст.) і Спаса-Праабражэнская царква Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра (помнік архітэктуры і манументальнага жывапісу XII ст.) у Полацку. У пратаколе нарады па выніках наведвання экспертамі ЮНЕСКА аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь, рэкамендаваных для ўключэння ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ад 31 кастрычніка 2003 г., запісана: "…аб'екты г. Полацка – прапанавана аб'яднаць пад адной назвай Спаса-Праабражэнская царква і Сафійскі сабор як прыклады архітэктуры полацкай зямлі, вылучыўшы ў гэтай тэме Сафійскі сабор XVIII ст. у якасці прыкладу трансфармацыі архітэктурнага стылю пад уплывам гістарычных фактараў…" [9, с. 22].

У 2006 г. было прынята рашэнне аб падрыхтоўцы дасье для ўключэння полацкіх помнікаў у Спіс ЮНЕСКА. Праца над напісаннем дасье цягнулася ўвесь 2007 г. Навуковае кіраўніцтва было даручана аўтару дадзенага артыкула. Канцэпцыя тэмы намінуемых помнікаў была прапанавана старшынёй Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА У.Р.Шчасным. У выніку абмеркаванняў і кансультацый з'явілася назва "Матэрыяльнае ўвасабленне духоўнай спадчыны Св. Ефрасінні Полацкай".

Працэс фарміравання рабочай групы, пратаколы пасяджэнняў, план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы матэрыялаў дасье, а таксама тэкст абгрунтавання універсальнай каштоўнасці аб'ектаў і крытэрыяў, па якіх помнікі намінаваны ў Спіс, змешчаны на сайце Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка [10].

Дадзеныя аб'екты знаходзяцца на тэрыторыі ахоўнай зоны музея-запаведніка і гістарычнага цэнтра горада Полацка, які ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь у якасці самастойнай адзінкі, што дае падставу для правядзення ў будучым шэрага мерапрыемстваў па стварэнні ўмоў для намінавання унікальнай гістарычнай тэрыторыі Полацка ў якасці кандыдатуры на уключэнне ў Спіс сусветнай культурнай спадчыны.

Згодна з крытэрыямі ўключэння аб'ектаў культуры ў Спіс сусветнай спадчыны (п. 29.2): "…падлягаць уключэнню ў Спіс могуць… 2. Гарады, якія развіваюцца паводле пэўных характэрных кірункаў і захавалі – часам у своеасаблівым натуральным акружэнні – архітэктурна-планіровачную арганізацыю і пабудовы, што адлюстроўваюць паслядоўныя этапы сваёй гісторыі. У дадзеным выпадку выразна абазначаная гістарычная частка горада мае прыярытэт па адносінах да непасрэднай навакольнай забудовы (п. 33) … перавага пры ўключэнні ў Спіс павінна аддавацца малым і сярэднім гарадскім паселішчам… (п. 34)…" [9, с. 28–29].

У Рэспубліцы Беларусь дзевяць гістарычных цэнтраў гарадоў (Мінск, Гродна, Навагрудак, Брэст, Пінск, Кобрын, Віцебск, Полацк, Магілёў) уключаны ў Дзяржаўны спіс як гісторыка-культурныя каштоўнасці [6, с. 29]. Гэта азначае, што закон ахоўвае цэласныя горадабудаўнічыя ансамблі. Самы старажытны горад краіны – Полацк – займае ў гэтым спісе вядучае месца.

Цікавасць да помнікаў Полацка стала фарміравацца ў пачатку XVIII ст. Пры наяўнасці багатай архітэктурнай спадчыны асаблівай папулярнасцю карысталіся культавыя пабудовы перыяду Старажытнай Русі. У XIX ст. гэтая цікавасць прывяла да асэнсавання неабходнасці захавання старажытных святыняў. У пачатку XX ст. была рэалізавана першая "археалагічная" рэстаўрацыя Сафійскага сабора. Пасля вялікага перапынку, у 1969 г., у горадзе ўзнавіліся рэстаўрацыйныя работы, якія вядуцца і сёння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З 1985 г. аб’ектам захавання спадчыны стаў увесь гістарычны цэнтр горада. Ён складаецца з некалькіх аб’ектаў: гарадзішча з паселішчам, Верхняга і Ніжняга замкаў, чатырох пасадаў (Вялікага, Запалоцкага, Задзвінскага і Астраўнога), двух манастыроў (Спаса-Еўфрасіннеўскага і Барыса-Глебскага) і некалькіх некропаляў. Гістарычная планіровачная структура горада, якая бесперапынна развівалася па прынцыпах, закладзеных у першым генеральным плане (1778 г., карэктура 1793 г.), канчаткова склалася ў XIX ст. [1, с. 102].

У 1983 г. пачалася распрацоўка гісторыка-архітэктурнага і інжынернага абгрунтавання рэгенерацыі гістарычнай забудовы горада. У 1985 г. быў завершаны праект, мэтай якога было комплекснае захаванне гістарычнага цэнтра горада. У 1988 г. гістарычны цэнтр Полацка быў унесены ў Спіс помнікаў гісторыі і культуры рэспубліканскага значэння. У 1989 г. быў прыняты “План рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры Полацка на 1989–2000 гг.”. У 1991 г. распрацавана праектная прапанова па комплекснай рэгенерацыі ансамбля галоўнай гарадской плошчы. У адпаведнасці з прынятым у 1992 г. законам “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны” гістарычнаму цэнтру Полацка быў прысвоены статус комплекснай каштоўнасці.

Тым не менш, пачынаючы з 2002 г., рэсурсы былі накіраваны не на рэалізацыю праекта рэгенерацыі, а толькі на добраўпарадкаванне горада, якое не ўзвысіла каштоўнасць гістарычнага цэнтра і не адыграла ніякай ролі ў рэгенерацыі яго гістарычнага характару. Наадварот, у выніку падрыхтоўчых работ да прыёму рэспубліканскага свята “Дажынкі” было наглядна прадэманстравана зніжэнне эфектыўнасці дзяржаўнай сістэмы аховы спадчыны. Стала відавочным, што ў краіне адсутнічаюць гарантыі захавання гістарычнага характару гарадоў і навукова-метадычная база захавання тэрыторый.

24 ліпеня 2006 г. уступіў у сілу закон “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь” (новая рэдакцыя падпісана Прэзідэнтам 9 студзеня 2006 г.), 15 чэрвеня 2006 г. сваёй пастановай (№ 762) Савет міністраў удакладніў і зацвердзіў Палажэнне аб ахове археалагічных аб’ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ. Гэтую заканатворчую ініцыятыву можна разглядаць як спробу выпрацаваць абгрунтаваныя метадалагічныя крытэрыі рэалізацыі культурнай палітыкі ў сферы спадчыны. Крокам у гэтым кірунку можна лічыць і падрыхтоўку мерапрыемстваў па ўключэнні пэўных аб’ектаў або комплексаў у Папярэдні спіс Намінантаў на ўключэнне ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

У нашым выпадку стратэгічнае значэнне мела вывядзенне на пярэдні план духоўнага аспекту функцыянавання спадчыны. “Духоўнае – заўсёды вышэйшая каштоўнасць для чалавека, у якой бы форме яно не праяўлялася, і, здатны ўспрыняць яго праявы ў творах культуры, чалавек усведамляе іх як спадчыну…” [7, с. 30].

Акрамя таго, у мэтах стварэння больш эфектыўнай сістэмы кантролю і выпрацоўкі прынцыпаў гарманічнага развіцця асяроддзя вакол гісторыка-культурных аб’ектаў неабходна ў тэрміновым парадку ўключыць у заканадаўчыя і нарматыўныя акты шэраг паняццяў (унікальная гістарычная тэрыторыя, гістарычны горад, горад-музей, гістарычны ландшафт), якія не былі ўнесены як асобныя катэгорыі ў дзеючыя ахоўныя дакументы. Гэта значна дапаможа спецыялістам у рабоце па ахове цэласнай гарадской прасторы, якая склалася гістарычна, і ў распрацоўцы рэгламенту горадабудаўнічай і гаспадарчай дзейнасці для суб’ектаў гаспадарання, накіраванай на стварэнне сістэмы мерапрыемстваў па забеспячэнні захаванасці гістарычна ўстойлівых прасторавых утварэнняў.

Рашэнне гэтых тэарэтычных і метадалагічных задач будзе спрыяць больш эфектыўнай і прафесійнай рабоце ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны і падрыхтоўцы да магчымага ўнясення унікальнай гістарычнай тэрыторыі г. Полацка ў якасці дадатковай кандыдатуры да такіх аб’ектаў, як Сафійскі сабор XI–XVIII стст. і Спаса-Праабражэнская царква XII ст. Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра на ўключэнне ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, разглядаючы яе як адзіную цэласную прасторавую структуру, якая мае культурна-гістарычныя і прыродныя каштоўнасці.

У сувязі з гэтым мы пазнаёміліся з дакументам” Пецярбургская стратэгія захавання культурнай спадчыны” [8], які стаў для нас арыенцірам у рабоце над праектам мадэлі стратэгіі захавання культурнай спадчыны Полацка.

Даследаванне ролі музеяў Полацка ў культурнай прасторы горада дало магчымасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

распрацаваць канцэпцыю і мадэль стратэгіі аховы і інтэрпрэтацыі гісторыка-культурнай спадчыны унікальнай гістарычнай тэрыторыі. Уключэнне Сафійскага сабора, помніка архітэктуры XI – XVIII стст., і Спаса-Праабражэнскай царквы, помніка архітэктуры і манументальнага жывапісу XII ст., разам з буйнымі буфернымі (ахоўнымі) зонамі ў сусветна вядомы спіс – гэта складаючая частка канцэпцыі захавання і інтэрпрэтацыі гісторыка-культурнай спадчыны горада. Працягам гэтай навуковай работы стала стварэнне мадэлі стратэгіі захавання культурнай спадчыны самага старажытнага беларускага горада. Дадзены праект вызначае асноўныя прыярытэты, крытэрыі і кірункі аховы культурнай спадчыны Полацка з улікам эпохі глабалізацыі, развіцця горада і інтэграцыі сучаснай архітэктуры ў гістарычную забудову, не парушаючы гістарычнага вобраза горада, прытрымліваючыся асноўнага прынцыпу – комплекснага захавання спадчыны на аснове збалансаваных і гарманічных адносін паміж патрабаваннямі грамадскасці, эканамічнай дзейнасці і аховы гістарычнага асяроддзя.

У праект стратэгіі ўвайшлі ніжэй пералічаныя раздзелы:

– Культурная спадчына ў эпоху глабалізацыі.
– Культурная спадчына Полацка. Каштоўнасць – у аўтэнтычнасці.
– Культурная спадчына як фактар устойлівага развіцця Полацка.
– Дзяржаўная палітыка ў галіне захавання культурнай спадчыны.
– Розныя канцэпцыі захавання культурнай спадчыны.
– Ахоўная практыка. Склад і прадметы аховы культурнай спадчыны.
– Пагроза і рызыка фізічнай страты гісторыка-культурнай спадчыны Полацка.
– Меры і метады супрацьдзеяння разбуральным з’явам.
– Рэстаўрацыя, кансервацыя, узнаўленне аб’ектаў культурнай спадчыны.
– Сучасная архітэктура ў кантэксце аховы культурнай спадчыны.
– Адкрытая гарадская прастора.
– Прававыя нормы па захаванні аб’ектаў культурнай спадчыны.
– Культурны турызм.
– Сацыяльнае і адукацыйнае значэнне культурнага турызму.
– Міжнароднае супрацоўніцтва.

Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік у пэўнай ступені выступае як сімвал стабільнасці развіцця музейнай справы краіны.

Распрацаваная намі канцэпцыя захавання гісторыка-культурнай спдчыны Полацка склала аснову дасье “Матэрыяльнае ўвасабленне духоўнай спадчыны св. Еўфрасінні Полацкай” на ўключэнне помнікаў горада ў Спіс сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА.

Прапанаваная і навукова абгрунтаваная намі мадэль стратэгіі захавання культурнай спадчыны Полацка прынята да рэалізацыі Полацкім гарадскім выканаўчым камітэтам.

Абапіраючыся на шматвекавую гісторыю і выконваючы сваю сацыяльную функцыю, Полацк далучаецца да выхавання паўнавартасных грамадзян – будаўнікоў сваёй краіны, творцаў будучыні. Ва ўмовах музеефікацыі цэлых гістарычных тэрыторый, як гэта адбываецца ў Полацку, працэс ідзе тым імклівей, чым хутчэй ён спрыяе далучэнню чалавека сённяшняга да спрадвечных гістарычных вартасцей свайго горада, рэгіёну, нарэшце, і краіны. Музей ужо сёння – неад’емная частка культурнай прасторы, самаідэнтыфікацыі народа, фарміравання яго самасвядомасці на падмурку спрадвечных агульначалавечых маральных каштоўнасцей і прынцыпаў.


*1. Глііннік, В.* Гістарычны цэнтр Полацка: досвед комплекснага захавання (1985–2002) / В.Гліннік // Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 28 лістапада 2002 г. – Мн., 2003. – С. 102–110.

*2. Конвенция* об охране всемирного культурного и природного наследия (16 ноября 1972 г.) // Конвенции и рекомендации ЮНЕСКО по охране культурного наследия / сост. В.В.Глинник. – Изд. 2-е, доп. – Мн.: Редакция журнала “Тыдзень”, 2000. – С. 51–66.

*3. Кондратьева, Г.* О сохранении памятников всемирного наследия в Республике Беларусь / Г.Кондратьева // Материалы ИКОМОС. Консервация и реставрация: научн.-информ. сб. / сост. и науч. ред. С.Г.Колесниченко; Рос. гос. б-ка. НИЦ “Информкультура”. – М.: Рос. гос. б-ка, 2007. – Вып. 2. – С. 33.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Лихачев, Д.С.* Раздумья о России / Д.С.Лихачев. – СПб.: Логос, 2006. – 654 с.

5. *Маковецкий, И.И.* Сохранение памятников всемирного культурного наследия в Российской Федерации / И.И.Маковецкий // Материалы ИКОМОС. Консервация и реставрация: науч.-информ. сб. / сост. и науч. ред. С.Г.Колесниченко; Рос. гос. б-ка. НИЦ "Информкультура". – М.: Рос. гос. б-ка, 2007. – Вып. 1. – С. 3–34.

6. *Мартыненко, И.Э.* Правовой статус, охрана и восстановление историко-культурного наследия / И.Э.Мартыненко. – Гродно: Гродн. гос. ун-т, 2005. – 343 с.

7. *Николаева, Н.В.* Наследие как предмет познания / Н.В.Николаева // Материалы ИКОМОС. Консервация и реставрация: науч.-информ. сб. / сост. и науч. ред. С.Г.Колесниченко; Рос. гос. б-ка. НИЦ "Информкультура" – М.: Рос. гос. б-ка, 2007. – С. 23–38.

8. *Петербургская* стратегия сохранения культурного наследия. Приложение к постановлению Правительства Санкт-Петербурга от 01.11.2005 № 1681. – СПб., 2006. – 40 с.

9. *Сайт* Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. – http://www.polotskmuzey.vitebsk.by.

10. *Сусветная* культурная і прыродная спадчына: зб. матэрыялаў па афармленні дакументаў для ўключэння аб'ектаў у Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА / навук. кансульт. У.Р.Шчасны, В.Я.Абламскі, І.М.Чарняўскі. – Мн.: Четыре четверти, 2004. – 132 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ